Разам мы — моцныя

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ І ВЫЗНАЧЭННЕ ВЕКТАРА РАЗВІЦЦЯ

**У глядзельнай зале наваполацкага Палаца культуры ААТ «Нафтан» у аўторак падчас рэгіянальнага форуму «Беларусь адзіная» не было свабодных месцаў. Да гэтага аналагічныя мерапрыемствы прайшлі ў Брэсцкай, Мінскай, Гомельскай абласцях.**

З усіх раёнаў Віцебшчыны прыехалі ў горад нафтаперапрацоўшчыкаў, каб узяць удзел у форуме прадстаўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улад, бізнесу, грамадскіх арганізацый, СМІ, сістэм адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны. Яны штодня маюць зносіны з людзьмі розных узростаў, прафесій, палітычных поглядаў. Таму ім было што запытаць і пра што распавесці. Сустрэча не стала фармальным мерапрыемствам, бо адразу ўсіх прысутных спікеры папрасілі выказваць свае думкі, дыскутаваць, падказваць далейшы ход гутаркі.

Перад пачаткам форуму ахвотныя азнаёміліся з выстаўкай, прысвечанай гісторыі «Нафтана». Шмат прыемных эмоцый пакінула сустрэча з гараджанамі, якія працуюць у цэнтры рамёстваў, у прыватнасці ствараюць мэблю з лазы, шмат зрабілі для адраджэння традыцыі батлейкі, вучаць гэтаму дзяцей і моладзь. Вельмі спадабалася і прэзентацыя вырабаў тых, хто наведвае гурткі структур сацыяльнай абароны насельніцтва.

Галоўная мэта рэгіянальных форумаў, якія праводзяць у абласцях, — кансалідацыя грамадства. Мы жывём у краіне, якую трэба цаніць, рабіць моцнай — такі лейтматыў мерапрыемства ўсебеларускага маштабу. Шмат на ім гаворыцца і наконт новага ўзроўню інтэграцыі з Расіяй.

**Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзім ГІГІН** падкрэсліў важнасць падпісання «дарожных карт» узаемадзеяння паміж Беларуссю і Расійскай Федэрацыяй. Дадзеная тэма сёлета і летась была магістральная, адзначыў ён.

«Інтэграцыя з Расіяй вядзецца з сярэдзіны 1990-х гадоў па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі. Праграма яе змяніла геапалітычную сітуацыю ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. І не таму, што гэта было выгадна беларусам, тады Расія была параўнальна слабая, з унутранымі супярэчнасцямі, — падзяліўся думкамі эксперт. — Інтуіцыя Аляксандра Лукашэнкі падказала, што нашы людзі вельмі хочуць быць бліжэй да Расіі».




**Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, эканамічны аглядальнік Аляксей АЎДОНІН** лічыць, што ўдзельнікі рэгіянальных форумаў «Беларусь адзіная» з'яўляюцца актывам, на заходняй тэрміналогіі — транзіцёрамі, якія прымаюць ідэю, потым яе транслююць у свае супольнасці. У сваіх калектывах ім трэба распавесці пра ключавыя канцэпцыі і бачанні, якія абмяркоўваюцца.



**Член Канстытуцыйнай камісіі, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, палітычны аналітык Аляксандр ШПАКОЎСКІ** закрануў тэму эканамічных санкцый з боку еўрапейскіх дзяржаў. На яго думку, яны не прывядуць да эканамічнага абвалу. Пры гэтым людзям трэба тлумачыць, хто вінаваты ў тым, што на сённяшні дзень неабходна трохі карэкціраваць выплаты бюджэтнікам, а павышэнне пенсій адбываецца не ў такім памеры, як планавалася. Ён нагадаў пра дасягненні апошніх гадоў: адкрыццё АЭС, трэцяй лініі метро ў Мінску, узвядзенне Петрыкаўскага горна-ўзбагачальнага камбіната...

Як член камісіі, якая працуе над прапановамі па змяненні некаторых пунктаў Асноўнага Закона краіны, Аляксандр Шпакоўскі цікавіўся думкамі па дадзенай тэме. Трэба прынцыпова вызначыцца, які павінен быць новы орган дзяржаўнага кіравання прадстаўнічай дэмакратыі — Усебеларускі народны сход, акцэнтаваў увагу ён. Вельмі важнае пытанне: ці трэба адмяніць смяротнае пакаранне або ўвесці мараторый на яго выкананне? Сацыёлагі, па словах эксперта, сцвярджаюць, што беларусы пакуль выступаюць за захаванне смяротнага пакарання. Актуальная, на яго думку, таксама тэма магчымасці прэтэндаваць на дэпутацкія мандаты прадстаўнікам працоўных калектываў без працэдуры збору подпісаў. Справа ў тым, што каля паловы ўнутранага валавога прадукту ў Беларусі ўжо генерыруецца прыватным сектарам. Да 70 % будзе ў найбліжэйшай перспектыве. І гэта ўклад у асноўным невялікіх фірмаў, супрацоўнікі якіх зацікаўленыя, каб іх інтарэсы прадстаўлялі ў парламенце.

**Навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, публіцыст і філасаф Аляксей ДЗЕРМАНТ** упэўнены, што ў жніўні мінулага года быў пройдзены Рубікон, які стаў чарговым этапам у развіцці Беларусі. Цяпер трэба зрабіць працу над памылкамі, лічыць спікер форуму. Прынцыповая пазіцыя ў адстойванні гістарычнай праўды, памяці, каштоўнасцяў — тое, чаму мы павінны навучыцца пасля 2020 года, каб не адбылося разбурэння фундамента грамадства, мяркуе ён.

**Загадчык аддзела чалавечага развіцця і дэмаграфіі Інстытута эканомікі НАН Беларусі, кандыдат эканамічных навук, дацэнт Анастасія БАБРОВА** ўпэўненая, што не бывае праблем маленькіх. І таму пацвярджэнне — падзеі мінулага года, калі жыццё даказала, што маленькія праблемы і незадаволенасць могуць парадзіць больш складаныя, якія ідуць за межы дапушчальнага.

Беларусь многаму можа навучыць іншыя краіны, у прыватнасці, у сферы лічбавізацыі. Ад кожнага з жыхароў краіны, моцных рэгіёнаў залежыць, як справіцца дзяржава з выклікамі. Важнае пытанне — роля жанчыны ў эканамічным, ідэалагічным і палітычным планах, падкрэсліла эканаміст.

Сярод тых, каго са сцэны папрасілі падзяліцца сваімі думкамі, быў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.** Ён як кіраўнік абласной арганізацыі «Белай Русі» паразважаў наконт магчымасці стварэння партыі ўлады на базе грамадскага аб'яднання. Рэгіянальны форум доўжыўся больш за тры гадзіны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**
*Наваполацк.*

# САЎНДТРЭКІ І QR-КВЭСТ...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета Дзень беларускага пісьменства атрымаецца сапраўды інтэрактыўным. Удзельнікі прэс-канферэнцыі распавялі адразу аб некалькіх лічбавых функцыях, якія будуць задзейнічаны падчас мерапрыемстваў. Па-першае, гэта QR-коды, размешчаныя на афішах фестывалю:

— Праз выкарыстанне лічбавых пляцовак мы імкнёмся прыцягнуць увагу моладзі да беларускай літаратуры. QR-коды будуць адсылаць карыстальнікаў да інфармацыі аб пісьменніках. Акрамя гэтага, упершыню пройдзе інтэрактыўны пешаходны QR-квэст «Капыльскі рог», падчас якога ўдзельнікі павінны будуць вырашыць лагічныя задачкі, — заінтрыгаваў міністр інфармацыі.

Другая, не менш цікавая інтэрактыўная опцыя, — мабільны дадатак для праслухоўвання аўдыякніг «Чытанка». На дадзены момант «Чытанка» ўжо працуе, даступная для спампоўвання і налічвае больш за 60 кніг беларускіх аўтараў. Лічбавыя магчымасці будуць выкарыстоўвацца і падчас мерапрыемстваў. Так, адкрыццё фестывалю пройдзе пад канцэпцыяй «Спевы дубраў»: на ўсталяваныя ЖК-экраны спраецыруюць прыродныя помнікі беларускай культуры. Экраны ўсталююць па перыметру залы, каб як мага найлепш паглыбіць удзельнікаў у «лясную» атмасферу.



Муралы з выявамі вядомых беларускіх пісьменнікаў з'явіліся на дамах Капыля напярэдадні свята.

— Закрыццё фестывалю таксама пройдзе ў фармаце, які выходзіць за межы простага канцэрта, — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.** — Упершыню нас чакае арыгінальная падача: сімбіёз саўндтрэкаў з фільмаў, якія былі зняты па творах беларускіх аўтараў. Запланавана, што тэлеэфір свята выйдзе ў той жа дзень.

Спікеры праанансавалі і асноўныя мерапрыемствы Дня беларускага пісьменства.

Міжнародны круглы стол «Пісьменнік і адзіная гуманітарная прастора» ўпершыню пройдзе за межамі цэнтра свята. Сустрэча з экспертамі і аналітыкамі адбудзецца 3 верасня ў Мінску, такое рашэнне было прынята арганізатарамі з-за шэрагу прычын. Першая і асноўная — вялікі ажыятаж. У гэтым годзе шмат краін выказалі жаданне прыняць удзел у круглым стале. Плануецца, што акрамя беларускіх удзельнікаў, мы ўбачым прадстаўнікоў Расіі, Германіі, Украіны, Казахстана, Балгарыі, Малдовы, Літвы. І гэта далёка не канчатковы спіс. Каб забяспечыць стабільнае анлайн-падключэнне, сустрэча пройдзе ў канферэнц-зале Палаца Рэспублікі. Кожны ахвотны зможа паглядзець трансляцыю праз YouTube.




Навукова-практычная канферэнцыя «Капыльскія чытанні» адбудзецца 4 верасня. Як адзначыў **Ігар КАПЫЛОЎ, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа,** гэта традыцыйнае мерапрыемства, якое ладзіцца з першых дзён правядзення свята:

— Сёлета ўся тэматыка канферэнцыі будзе звязана з Годам народнага адзінства. Удзел возьмуць вядучыя вучоныя нашай краіны, у першую чаргу прадстаўнікі акадэмічных інстытутаў. Адметна, што ў нашай канферэнцыі вынікамі сваіх навуковых даследаванняў падзеляцца пісьменнікі і творчая інтэлігенцыя раёна. Канферэнцыя будзе мець некалькі блокаў: гістарычныя, моўазнаўчыя, літаратуразнаўчыя. Акрамя гэтага, падчас «Капыльскіх чытанняў» адбудзецца прэзентацыя 23-томнага выдання твораў Івана Шамякіна.

Яшчэ адно знакавае мерапрыемства — Нацыянальная літаратурная прэмія. Цырымонія ўзнагароджання адбудзецца падчас урачыстага адкрыцця фестывалю. Уручаць прэмію будуць адразу ў шасці намінацыях: «Проза», «Паэзія», «Публіцыстыка», «Крытыка», «Дэбют» і «Лепшы твор» для дзяцей і юнацтва.

Нельга забывацца і аб сустрэчах з пісьменнікамі. Падчас свята адбудзецца творчы вечар старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца. Таксама будуць ладзіцца прэзентацыі і аўтограф-сесіі з Сяргеем Трахімёнкам, Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, Вячаславам Бандарэнкам.

Ігар Бузоўскі адзначыў, што на Дні беларускага пісьменства з вялікімі знiжкамі будуць прадавацца кнігі дзяржаўных выдавецтваў. Гэта было зроблена для папулярызацыі друкаваных версій.

Капыль сардэчна запрашае гасцей і гатовы іх сустракаць!

**Арына КАРПОВІЧ.**